**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ**

Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае прыняць удзел у
**XX Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях**

**Арганізатары:**
Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Нацыянальная бібліятэка Беларусі

**Тэрмін правядзення:**
18–19 красавіка 2024 г.

**Фарматы правядзення:**
Канферэнцыя пройдзе ў гібрыдным фармаце. Прадугледжаны вочны ўдзел (г.Мінск, пр. Незалежнасці, 116) і анлайн.

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

- рукапісная кніжнасць Беларусі;
- Ф. Скарына і яго паслядоўнікі – беларускія тыпографы і выдаўцы XVI–XVIII стст.;
- 450-годдзе пачатку дзейнасці друкарні Мамонічаў (1574–1623);
- 395-годдзе са дня нараджэння асветніка, царкоўнага і грамадскага дзеяча Сімяона Полацкага (1629–1680);
- 210-годдзе са дня нараджэння гісторыка, археолага, этнографа, краязнаўцы Яўстафія Тышкевіча (1814–1873);
- 200-годдзе выдання першага зборніка археаграфічных дакументаў па гісторыі Беларусі «Белорусского архива древних грамот» (Масква, 1824), падрыхтаванага І. Грыгаровічам пры ўдзела графа М.П. Румянцава;
- старадрукі XVI–XVIII стст.;
- стараверская рукапісная і друкаваная кніга;
- беларуская кніга XIX–XX стст.;
- 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;
- 45-годдзе навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства;
- гістарычныя бібліятэкі і развіццё бібліятэчнай справы Беларусі;
- улік і апісанне кніжных помнікаў Беларусі;
- сучасныя рэаліі кніжнай культуры і мастацтва кнігі;
- беларуская кніга ў айчынных і замежных зборах;
- кніга ў музейнай прасторы;
- кніга ў сучасным сацыякультурным і інфармацыйным асяроддзі;
- асобы беларускага кнігазнаўства.

**Мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, англійская.

**Умовы ўдзелу:**
Для ўдзелу ў канферэнцыі з дакладам, паведамленнем або ў якасці госця неабходна прайсці анлайн-рэгістрацыю на партале www.nlb.by.

**Пражыванне, харчаванне, транспартныя выдаткі –**
за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

**Патрабаванні да тэксту даклада:**
Плануецца выданне зборніка матэрыялаў канферэнцыі. Прымаюцца арыгінальныя работы на беларускай, рускай, англійскай мовах, якія маюць навуковае і прыкладное значэнне. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і апублікавання. Файл з тэкстам даклада неабходна выслаць на электронную пошту redkaja@nlb.by **не пазней за 15 сакавіка 2024 г.**

**Афармленне даклада:**
1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) аўтара / сааўтараў, поўная назва арганізацыі, горад, краіна; прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) асобы, якая будзе прадстаўляць даклад на канферэнцыі, назва даклада.
2. Аб'ём даклада разам з рэзюмэ, ілюстрацыямі і дадаткамі – не больш за 6 *старонак фармату А4, Times New Roman, кегель 13, паўтарачны міжрадковы* інтэрвал, тып файла – .doc, .docx або .rtf (Microsoft Word).
3. Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту ў алфавітным парадку. Спасылкі афармляюцца ў квадратных дужках, напрыклад [3, с. 15].
4. Рэзюмэ на рускай і англійскай мовах аб'ёмам не больш за 400 сімвалаў кожнае (з прабеламі).

**Патрабаванні да відэадаклада:**
- арыентацыя відэа – гарызантальная;
- відэазапіс павінен ствараецца з мікрафонам, пры добрым асвятленні і адсутнасці пабочных шумаў;
- працягласць відэа – не больш за 10 хвілін.

**Патрабаванні да даклада-прэзентацыі:**
- слайд-шоу з закадравым агучаным тэкстам павінен мець настройку часу паказу слайдаў;
- у прэзентацыі першы кадр павінен утрымліваць назву канферэнцыі, назву даклада, імя аўтара;
- працягласць прэзентацыі – не больш за 10 хвілін.

Файл з відэадакладам або прэзентацыяй неабходна выслаць на электронную пошту redkaja@nlb.by **не пазней за 10 красавіка 2024 г.**

**Кантакты:**
Кірэева Галіна Уладзіміраўна, Карнілава Таццяна Уладзіміраўна, Шопіна Марыя Міхайлаўна.
Тэлефоны: +375 17 293 26 12, +375 17 293 27 83, +375 17 293 27 81.
E-mail: redkaja@nlb.by
Каваленка Ганна Мікалаеўна (для замежных удзельнікаў)
Тэлефон: +375 17 293 27 64,
E-mail: ird@nlb.by